## НАЙБОЛЬШ ВАЖНЫЯ ЗМЕНЫ З 1 СТУДЗЕНЯ 2018 Г.

**Заява аб намеры даручыць працу замежнаму грамадзяніну:**

- можа датычыць падгруп, не звязаных з дазволам на сезонныя працы;
- працадаўца абавязаны паведаміць упраўленню аб тым, што Вы пачалі працаваць (не пазней, чым у дзень пачатку працы) або не пачалі працаваць (на працягу 7 дзён з даты пачатку працы, названай у заяве);
- пры падліку перыядаў выканання працы прымаюцца пад увагу перыяды, на якія была зарэгістравана заява. Калі Вы закончылі працу раней, чым пазначана ў заяве, неабходна паведаміць пра гэта ўпраўленню працы. Гэта можаце зрабіць Вы або Ваш працадаўца. УВАГА: прадастаўленне несапраўднай інфармацыі караецца штрафам.

**Падчас працы па заяве (6 месяцаў на працягу 12 месяцаў) або дазволе на сезонную працу (9 месяцаў на працягу каляндарнага года) Вы можаце змяніць працадаўцу. Аднак ён павінен атрымаць для Вас новы дакумент, які дазваляе Вам працаваць на польскім рынку працы.**

**Дазвол на сезонную працу:**

- дае права працаваць у падгрупах, якія лічацца сезоннымі;
- Вы можаце працаваць максімум 9 месяцаў на працягу **каляндарнага года**. У выпадку ўезду ў Польшчу на сезонную працу 9 месяцаў адлічваюцца з даты ўезду ў Шэнгенскую зону;
- працадаўца абавязаны накіраваць копію дакумента на побыт і паведаміць упраўленню пасля Вашага прыбыцця, па якім адрасе Вы пражываеце ў Польшчы – толькі тады ўпраўленне дасць дазвол на сезонную працу, які дае Вам права працаваць. *Вы можаце працаваць у той час, калі чакаеце дазволу на сезонную працу, г.зн. пасля таго, як працадаўца паведаміць упраўленню, што Вы прыехалі. Аднак праца павінна выконвацца на ўмовах, прадугледжаных пасведчаннем аб рэгістрацыі, выдадзеным раней упраўленнем.*

**Дазволы на сезонную працу датычаць усіх замежных грамадзян з краін, якія не ўваходзяць у ЕС/ЕЭЗ, заявы датычаць грамадзян Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі і Украіны.**

**Незалежна ад віда дакумента, які дазваляе працаваць на польскім рынку працы:**

- працоўная дамова паміж Вамі і працадаўцам павінна быць заключана ў пісьмовай форме;
- працадаўца абавязаны даць Вам пераклад дамовы на зразумелую для Вас мову;
- працадаўца абавязаны на працягу 7 дзён зарэгістраваць Вас для сацыяльнага страхавання і медыцынскага страхавання, што дае Вам права атрымаць дапамогу ў выпадку хваробы, няшчаснага выпадку або цяжарнасці і бясплатна карыстацца медыцынскімі паслугамі (не прымяняецца да дамовы падраду);
- працадаўца абавязаны праверыць тэрмін дзеяння і зрабіць копію Вашага дакумента, які дае Вам права знаходзіцца ў Польшчы.

**У выпадку працоўнай дамовы Вы маеце права на мінімальную польскую зарплату (у 2018 годзе – 2100 злотых з ПДВ); мінімальная пагадзінная стаўка ў Польшчы ў 2018 г. складае 13,70 злотых з ПДВ (датычыць дамоў даручэння, не прымяняецца да дамоў падраду).**

## ЗВЯРТАЙЦЕ ЎВАГУ НА СВАЮ БЯСПЕКУ!

Не аддавайце нікому свой пашпарт або дакумент, які пацвярджае асобу;

Вы маеце права атрымаць копію дазволу на працу, пасведчання аб рэгістрацыі або зарэгістраванай упраўленнем заявы;

Асцерагайцеся нелегальных пасярэднікаў;

Праверце свайго працадаўцу (Вы можаце звязацца з ім па тэлефоне, праверыць яго фірму ў Інтэрнэце або ў базе АКПА (REGON) www.stat.gov.pl/regon/ і Дзяржаўнага судовага рэестра (KRS) www.krs-online.com.pl;

Калі працу Вам даручае польскае агенцтва па часовым працаўладкаванні, праверце на сайце stor.praca.gov.pl, ці ён мае неабходны сертыфікат.

Ministerstwo Rodziny, Pracy i Polityki Społecznej

# ПРАЦА Ў ПОЛЬШЧЫ

**інфармацыя для замежных грамадзян**

(не датычыць грамадзян ЕС, ЕЭЗ і Швейцарыі)





Падрабязней на сайце www.mrpips.gov.pl

**асноўныя палажэнні з 1 студзеня 2018 г.**

## ДЛЯ ЛЕГАЛЬНАЙ ПРАЦЫ Ў ПОЛЬШЧЫ ЗАМЕЖНАМУ ГРАМАДЗЯНІНУ НЕАБХОДНА:

мець дакумент, які дазваляе яму працаваць на польскім рынку працы (гэта можа яго не датычыць згодна з асобымі правіламі);

знаходзіцца легальна на тэрыторыі Польшчы, а падстава для побыту павінна даваць права на працу (напрыклад, адпаведная віза або дазвол на побыт);

выконваць працу на ўмовах, прадугледжаных дазволам або заявай;

заключыць дамову з працадаўцам, звязаную з працай.

### Замежны грамадзянін можа выконваць працу выключна для працадаўцы, названага ў дазволе/заяве!

**Нелегальная праца ў Польшчы ці нелегальны побыт можа мець сур'ёзныя наступствы, такія, як штраф або высылка з Польшчы. Рашэнне аб высылцы звязана з унясеннем у спіс замежных грамадзян, побыт якіх непажаданы ў Польшчы, і ў Шэнгенскую інфармацыйную сістэму для адмовы ва ўездзе, а таксама з немагчымасцю паўторнага ўезду ў Шэнгенскую зону.**

## ДАКУМЕНТЫ, ЯКІЯ ДАЗВАЛЯЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ПОЛЬСКІМ РЫНКУ ПРАЦЫ

- **Дазвол на працу** – выдадзены ваяводай **па заяве працадаўцы**;

**5 відаў дазволаў на працу:**

**A** – калі замежны грамадзянін працаўладкаваны суб'ектам у Польшчы;

**B** – калі замежны грамадзянін займае пасаду ў праўленні, выступае ў якасці поўнага партнёра або даверанай асобы;

**C, D, E** – у выпадку накіравання замежнага грамадзяніна ў камандзіроўку на тэрыторыю Польшчы.

- **Дазвол на сезонную працу – від S** – (новы інструмент, уведзены з 1 студзеня 2018 г.) – выдадзены старастай **па заяве працадаўцы** – дае права працаваць у падгрупах, якія лічацца сезоннымі, на працягу 9 месяцаў каляндарнага года (УВАГА – ёсць адрозненні ў выпадку амежнага грамадзяніна, які знаходзіцца ў Польшчы, і замежнага грамадзяніна, які прыбывае з-за мяжы).

### Сезонная праца магчыма выключна на падставе дазволу на сезонную працу!

- **Заява аб намеры даручыць працу замежнаму грамадзяніну** (змены з 1 студзеня 2018 г.) – **зарэгістраваная** ў павятовым упраўленні працы **працадаўцам** у выпадку грамадзян Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі і Украіны, дае права выконваць несезонную працу без дазволу на працягу 6 месяцаў у наступныя 12 месяцаў;
- **Дазвол на часовы побыт і працу** – выдадзены ваяводай па заяве **замежнага грамадзяніна**, дае права на выкананне працы і побыт.

## ВАЖНА:

- Ініцыятарам працаўладкавання, як правіла, з'яўляецца **працадаўца** (дазвол на працу, дазвол на сезонную працу, заява);
- Калі Вы працуеце **згодна з заявай на падставе працоўнай дамовы**, а Ваш працадаўца хоча працягваць супрацоўніцтва з Вамі працяглы час, ён можа, ужо пасля 3 месяцаў выканання Вамі працы, падаць ваяводзе заяву аб дазволе на працу (або Вы – заяву аб дазволе на побыт і працу) на больш простых умовах. Калі заява на атрыманне дазволу прызнаецца поўнай, Ваша праца будзе лічыцца легальнай да выдачы рашэння;
- Калі Вы грамадзянін **Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі і Украіны і выконвалі для свайго працадаўцы сезонную працу мінімум адзін раз на працягу апошніх 5 гадоў**, і ён хоча наняць Вас на працу, якая лічыцца сезоннай, ён можа атрымаць шматсезонную рэгістрацыю (у рэестры сезонных прац на чарговыя тры гады). На яго падставе Вы можаце падаваць заявы на атрыманне візы на працягу гэтых трох гадоў. Кожны год дазвол на працу выдаецца ў адпаведнасці з агульнымі палажэннямі (глядзіце трэці пункт у раздзеле "Дазвол на сезонную працу");
- У Польшчы можна выконваць працу на падставе розных дамоў (у тым ліку працоўнай дамовы, дамовы даручэння, дамовы падраду). Від дамовы звязаны з характарам працы і аб'ёмам правоў і абавязкаў. **Найбольш правоў і максімальную ахову работніку гарантуе працоўная дамова**.

**Дзяржаўная інспекцыя працы** дае бясплатныя кансультацыі і інфармацыю па працоўным праве і легальным працаўладкаванні, разглядае скаргі работнікаў на невыкананне працадаўцамі працоўнага заканадаўства, тэхнікі бяспекі і аховы працы, а таксама на нелегальнае працаўладкаванне. Адрасы і тэлефоны акружных інспекцый працы (у кожным ваяводскім цэнтры) і мясцовых аддзяленняў (у іншых буйных гарадах) глядзіце на сайце www.pip.gov.pl